# Народна-гаспадарчы план 1936 стаханаўскага года

*(Даклад старшыні Совета Народных Камісараў БССР таварыша Н. М. Галадзеда на III сесіі ЦВК БССР XI склікання)*

## 1. Да вынікаў 1935 года

Таварышы, нам прадстаіць абгаварыць і зацвердзіць народна-гаспадарчы план і бюджэт на 1936 год.

У пачатку студзеня гэтага года тав. Молатаў у сваім дакладзе на сесіі ЦВК СССР падвёў вынікі 1935 г. і вызначыў задачы плана на 1936 год.

Як вынікі гаспадарчага будаўніцтва ў 1935 годзе, так і задачы плана 1936 года поўнасцю пацвярджаюць той прагноз, які даў таварыш Сталін яшчэ ў 1933 г. у сваім дакладзе аб выніках першай пяцігодкі.

Таварыш Сталін тады сказаў, што „мы можам дабіцца таго, што, скажам, да другой паловы другой пяцігодкі зможам узяць новы магутны разбег як у галіне будаўніцтва, так і ў галіне прыросту прамысловай прадукцыі".

1935 год—трэці год другой пяцігодкі—якраз і паклаў пачатак гэтаму ўсеагульнаму паскоранаму разбегу ўсіх галін народнай гаспадаркі.

Вось факты і лічбы, якія сведчаць аб гэтым новым магутным разбегу.

### 1. Вынікі 1935 года па выкананню планаў прамысловасці

У 1935 годзе прамысловасць Саюза ССР павялічыла сваю прадукцыю на 20,4 проц. у параўнанні з 1934 годам замест 16 проц. прыросту, вызначанага па плану,

План прамысловасці СССР у цэлым перавыканан на 5 проц., што ў сумарным выражэнні складае 3 мільярды рублёў. Прадукцыя ўсёй прамысловасці Саюза дасягнула 65,9 млрд. рублёў у цэнах 1926—27 гадоў.

У гэтай агульнай прадукцыі вытворчасць сродкаў вытворчасці—машын, варштатаў, рознага абсталявання, здабыча вугалю, нафты і т. д.—складае 37,2 млрд. руб., а вытворчасць прадукцыі спажывання павялічалася за год на 4,4 млрд. руб. і складае ў агульнай суме 28,7 млрд. руб.

Усімі саюзнымі прамысловымі наркаматамі план 1935 года перавыканан. Прырост прамысловай прадукцыі за адзін год па Саюзу складае звыш 11 мільярдаў рублёў што ў супаставімых

лічбах перавышае ўсю прадукцыю прамысловасці царскай Расіі ў 1913 годзе.

На аснове такога росту социялістычнай індустрыі наша краіна пашла далёка ўперад у справе выканання асноўнай гаспадарчай задачы другой пяцігодкі—у справе завяршэння тэхнічнай рэканструкцыі народнай гаспадаркі ва ўсіх яе галінах.

З указаных фактаў і лічбаў ярка відаць, што прадсказаны таварышам Сталіным магутны новы разбег у галіне прамысловай вытворчасці ёсць у наяўнасці, і наша краіна рэалізуе тую перавагу ў вытворчасці, якая склалася ў выніку паспяховай індустрыялізацыі СССР. І 1935 год якраз і з'явіўся тым годам, які пачынае новы магутны разбег у галіне соцыялістычнага будаўніцтва на новай базе, на пашыранай базе сучаснай соцыялістычнай індустрыі і сучаснай тэхнікі. Апрача таго, у нас ужо створаны кваліфікаваныя кадры, здольныя аўладаць тэхнікай і рушыць гэту тэхніку наперад. А якія-ж вынікі ёсць у выкананні плана прамысловасці БССР за 1935 год?

Мы таксама вышлі са значным перавыкананнем вытворчых планаў прамысловасці, і наша прамысловасць свой план 1935 года выканала датэрмінова.

Уся прамысловасць БССР перавыканала свой план на 5,9 проц. і дала прырост прадукцыі ў параўнанні з 1934 годам на 23 проц., у тым ліку прамысловасць саюзнага падпарадкавання выканала свой план на 107,9 проц. з прыростам прадукцыі на 26,2 проц.; прамысловасць НК Мясцпрома БССР план выканала на 107,1 проц. з прыростам прадукцыі супроць 1934 года на 16,4 проц.; прамысловасць промкааперацыі план выканала на 107,9 проц. з прыростам прадукцыі на 24,4 проц. Нізавая прамысловасць дала прырост прадукцыі на 6,8 проц. супроць 1934 года, але плана свайго недавыканала. План выканан толькі на 85,5 проц. Іншая прамысловасць прырост прадукцыі дала на 46,7 проц. Але план таксама недавыканала—выканала на 89,2 проц.

Я хачу спыніцца спецыяльна на промкааперацыйнай прамысловасці.

У нас часта недаацэньваюць значэнне промкааперацыйнай і нізавой прамысловасці. Гэта няправільна, таварышы. З тых лічбаў, якія я назаву вам, відаць, што промкааперацыйная прамысловасць займае значную ўдзельную вагу ў агульнай прадукцыі прамысловасці. Напрыклад, прадпрыемствы НК Мясцпрома БССР выпрацавалі прадукцыі на суму 356,8 мільёна руб., а прамысловасць промкааперацыі дала прадукцыі на 266,5 млн. руб. Як бачыце, толькі на 90 мільёнаў рублёў менш, чым прамысловасць НК Мясцпрома. А калі дадаць яшчэ да гэтай прадукцыі промкааперацыі прадукцыю, якая выпрацоўваецца нізавой і іншай прамысловасцю, то ўся сума будзе раўняцца 361 мільёну руб., бо яшчэ нізавая прамысловасць дае 94,5 млн. руб. Прычым значэнне гэтага віду прамысловасці немалое, бо яна выпрацоўвае, галоўным чынам, рэчы шырокага спажывання. Вядома, што па сваёй структуры прамысловасць, аб'яднаная ў НК Мясцпроме, дае больш складаную прадукцыю, у тым ліку і сродкі вытворчасці, але ў агульнай суме роля прамысловасці промкааперацыі і нізавой з'яўляецца вялікай.

План 1935 года НК мясцовай прамысловасці БССР быў выканан 11 снежня. Датэрмінова выканалі планы 12 трэстаў і

НАУЧНИЙ КА... Библиотека Института Эко... при ЦИК...

кіраўніцтваў з 17. Выканалі і перавыканалі гадавы план 143 прадпрыемствы і недавыканалі план 33 прадпрыемствы.

Сістэма Белкаапромсовета выканала гадавы план [illegible], прамысловасць сістэмы НКЛеса выканала гадавы план 10 снежня, прамысловасць НК Харчпрома СССР выканала гадавы план 10 снежня і прамысловасць НКЛП СССР выканала план 25 снежня.

Значыць, у нас ужо ёсць нямала такіх трэстаў і прадпрыемстваў, якія навучыліся па-бальшэвіцку выконваць і перавыконваць свае планы.

Гэтыя факты гавораць нам аб тым, што і прамысловасць БССР дасягнула значных поспехаў у сваёй рабоце і таксама рушыла па шляху таго гіганцкага разбегу, аб якім сказаў таварыш Сталін. Але было-б няправільным, калі-б мы гаварылі толькі аб поспехах і нічога не сказалі-б аб тых недахопах і нават прарывах, якія яшчэ маюць месца ў некаторых трэстах, а прарывы гэтыя ёсць. Я іх прывяду для таго, каб завастрыць увагу членаў ЦВК, таксама і ўсіх гаспадарнікаў і рабочых на ліквідацыю гэтых недахопаў, каб іх у 1936 годзе не дапускаць.

Напрыклад, тарфяная прамысловасць БССР хоць і дала павелічэнне прадукцыі на 16,6 проц. супроць 1934 г., але план свой выканала толькі на 86,6 проц. А вы ведаеце значэнне тарфяной прамысловасці для народнай гаспадаркі БССР. Трэба мець на ўвазе, што амаль уся энергетыка ў БССР базіруецца на тарфяным апале. Значыць, недавыкананне плана тарфяной прамысловасці адбіваецца на ўсіх галінах прамысловасці БССР.

Я ўжо не гавару аб тым, што некаторыя гаспадарнікі з торфапрамысловасці яшчэ не зжылі ў сябе яўна антыдзяржаўных тэндэнцый—напісалі рапарты па ўсіх адрасах аб тым, што выканалі план торфаздабычы, а калі мы праверылі наяўнасць торфу, аказалася, што некаторыя дырэктары торфзаводаў сталі на шлях очкаўцірацельства, далі ілжывыя лічбы аб выкананні плана.

Мы гэтыя факты разабралі. У прыватнасці, такія факты былі на Асінторфе, вынеслі адпаведную пастанову Соўнаркома, якую на днях апублікуем у газетах, каб непаважна было такім горагаспадарнікам у далейшым ашукваць рабочых і дзяржаву.

Горна-хімічная (фасфарытная) прамысловасць выканала свой план на 75 проц., хоць прырост прадукцыі супроць 1934 г. з'яўляецца вялікім—115 проц.

Недавыканаў свой план і Магілеўскі трубаліцейны завод. Прырост прадукцыі трубаліцейны завод даў на 67,3 проц., але план выканаў толькі на 80,1 проц.

Хімічная прамысловасць (ацэтон, парфумерыя і т. д.) план выканала на 60,2 проц. і прадукцыі дала ўсяго 65,7 проц. супроць 1934 года.

З прамысловасці промкааперацыі таксама некаторыя галіны не выканалі свой план, напрыклад: па будматэрыялах промкааперацыя выканала план на 75,3 проц., па трыкатажнай прамысловасці—80,7 проц.

Ёсць і іншыя трэсты, якія недавыканалі план, але на іх я спыняцца не буду.

Назваў гэтыя галіны прамысловасці я для таго, каб паказаць, што ў нас на агульным фоне добрай работы прамысловасці ёсць яшчэ асобныя галіны, якія з'яўляюцца плямай на нашай добрай рабоце. Задача заключаецца ў тым, каб гэтыя

прарыўныя галіны прамысловасці выцягнуць на належную вышыню, бо таварышы, якія працуюць у названых мною трэстах, павінны памятаць, што іх прарывы перакрылі другія работнікі другія рабочыя, якія перевыканалі свой промфінплан па ўсіх паказальніках і далі магчымасць выйсці прамысловасці БССР на перадавыя пазіцыі, што было спецыяльна і адзначана пастановай саюзнага ўрада.

1936 год павінен быць годам такім, калі ў нас не будзе ні аднаго трэста, ні аднаго прадпрыемства, не выканаўшага свой промфінплан.

## 2. Вынікі работы транспарту ў 1935 годзе

Значныя поспехі ў 1935 г. па ўсяму Совецкаму Саюзу ёсць у рабоце транспарту, асабліва чыгуначнага. Трэба сказаць, што чыгуначны транспарт і па чыгунках на тэрыторыі БССР, як і водны транспарт Беларусі вышлі на перадавыя пазіцыі ў 1935 г. Зараз па ўсяму Совецкаму Саюзу, у тым ліку і па Беларусі, транспарт не з'яўляецца тормазам для развіцця народнай гаспадаркі. Наадварот, мы мелі такое становішча, калі работнікі чыгунак і воднага транспарту скардзіліся нам на тое, што некаторыя нашы гаспадарчыя арганізацыі і ўстановы падводзяць чыгуначнікаў і воднікаў і не дастаўляюць ва ўстаноўлены час тыя тавары і грузы, якія належаць да перавозкі, чым па сутнасці зрывалі пагрузку і выгрузку вагонаў.

Я не буду гаварыць аб сур'ёзным народнагаспадарчым значэнні транспарту. Аб гэтым выразна сказана на XVII з'ездзе ВКП(б) таварышам Сталіным. Задача заключалася ў тым, каб выцягнуць транспарт на перадавыя пазіцыі і трэба сказаць, што 1935 год быў такім годам, калі транспарт, а асабліва чыгуначны пад кіраўніцтвам тав. Л. М. Кагановіча, вышаў на гэтыя перадавыя пазіцыі. Зараз задача заключаецца ў тым, каб усе нашы гаспадарчыя арганізацыі—так званыя кліенты чыгуначнага і воднага транспарту—не спазняліся і тым самым не тармазілі паспяховае развіццё чыгуначных і водных перавозак.

## 3. Вынікі работы па ўздыму сельскагаспадарчай вытворчасці

Вялікія дасягненні мы маем у 1935 годзе і па сельскай гаспадарцы. Сельская гаспадарка ў 1935 годзе дабілася рашучага пераломy па ўздыму сваёй вытворчасці. Ва ўсім Совецкім Саюзе павялічан збор хлябоў, і ўжо ў 1935 годзе збор зернавых па Саюзу складае 5.521 млн. пудоў. Значна ўзняўся валавы збор бавоўны і ільну. У 1935 годзе сабрана бавоўны сырцу 17 млн. цэнтнераў супроць 11,8 млн. цэнтнераў у 1934 г. Валавы збор ільноваланка ўзняўся да 5,5 млн. цэнтнераў супроць 5,3 млн. цэнтнераў у 1934 г.

Я не буду прыводзіць больш лічбаў па сельскай гаспадарцы Саюза ССР. Усе гэтыя факты і лічбы былі ўжо апублікаваны ў дакладзе тав. Молатава і ў дакладзе тав. Межлаука.

Скажу толькі аб тым, чаго мы дабіліся па ўздыму сельскагаспадарчай вытворчасці ў БССР.

Валавы збор зернавых у БССР за 1935 год складае прыкладна 140 млн. пудоў. Ураджай зернавых з гектара ў нас вы-

ведзен у 8,08 цэнтнера, а ў 1934 г. ураджай зернавых у нас раўняўся 9,1 цэнтнера з гектара.

Такім чынам, таварышы, хоць у агульным зборы зернавых мы засталіся, прыкладна, на ўзроўні 1934 г., але гэта, на жаль, не за кошт павышэння ўраджаю, бо ўраджай ў нас быў ніжэйшы, на цэлы цэнтнер не дабралі з гектара. Толькі дзякуючы лепшай арганізаванасці пры ўборцы хлябоў нам удалося значна скараціць страты і захаваць агульны ўзровень валавога збору.

Мы павінны, чаго-б гэта ні каштавала, знішчыць гэтыя недахопы ў барацьбе за ўраджай. Трэба думаць, што ў некаторых мясцах меў месца такі факт: мы, як усім гэта ўжо вядома, дабіліся значных поспехаў па ўздыму сельскай гаспадаркі ў 1934 г., за што БССР атрымала ордэн Леніна; не выключана тое, што некаторыя нашы работнікі супакоіліся на дасягнутых поспехах і сталі пачываць на лаўрах, думаючы, што раз БССР атрымала ордэн Леніна, значыць у далейшым справа пойдзе сама па сабе.

ЦК КП(б)Б і Соўнарком БССР своечасова і не раз папярэджвалі зямельныя органы, раённыя арганізацыі і інш. аб тым, каб не супакойвацца на дасягнутых поспехах і не пачываць на лаўрах, але не ўсюды гэта папярэджанне ўлічвалася.

Некаторыя людзі гавораць аб тым, што ў 1935 г. былі неспрыяючыя метэаралагічныя ўмовы, і што яны мелі ўплыў на ўраджай. Мы не можам з гэтым згадзіцца, бо гэта—апартуністычныя матывы. Нельга адмаўляць уплыву метэаралагічных умоў на сельскую гаспадарку, але нельга і прыкрываць сваю дрэнную работу неспрыяючым надвор'ем.

Варта ўспомніць выступленні майстроў высокага ўраджаю на ўсесаюзнай нарадзе ў Крэмлі, таксама і выступленні майстроў па высокай ураджайнасці Беларусі на нарадзе вось у гэтай зале, якая закончылася 4—5 дзён таму назад.

З гэтых выступленняў відаць, што барацьба за ўраджай залежыць ад канкрэтных людзей, бо прыклады, якія прыводзіліся ў нас, у Беларусі, на гэтай нарадзе, сведчаць, што метэаралагічныя ўмовы былі аднолькавыя ў розных калгасах, а ўраджай не аднолькавы. Значыць, там, дзе людзі лепш працавалі, там неспрыяючае надвор'е мала адбілася і наадварот, дзе не працавалі як след, там, аказалася, „пашкодзіла" надвор'е. Гэта трэба ўлічыць.

Па бульбе мы дабіліся ў 1935 г. павышэння ўраджайнасці: ураджай бульбы дасягнуў да 112,6 цэнтнераў з гектара ў сярэднім па БССР супроць 105 цэнтнераў у 1934 г., а валавы збор бульбы мы давялі да 7.506,5 тыс. тон.

Па ўраджаю ільноваланна мы таксама дабіліся некаторага павышэння: замест 2,2 цэнтнера ў 1934 годзе мы ўжо атрымалі 2,4 цэнтнера з гектара ў 1935 г. Валавы збор ільноваланна ў 1935 г. складае 59.435 тон.

Але трэба падкрэсліць, што як ураджай па бульбе, так і па ільну яшчэ зусім нізкі. Мы павінны яго рашучым чынам павышаць.

Як увесь Савецкі Саюз, так і Беларусь у 1935 г. маюць значныя дасягненні па развіццю жывёлагадоўлі. Развіццё жывёлагадоўлі ва ўсёй нашай дзяржаве пашло ўверх. Калі ў 1934 г. па некаторых галінах жывёлагадоўлі мы дасягнулі стабільнага становішча, то 1935 год з'явіўся сапраўдным пераломным годам.

Перад тым, як прывесці лічбы росту жывёлагадоўлі ў Саюзе ССР і ў Беларусі, я павінен адзначыць, што сярэдні прырост пагалоўя жывёлы па Саюзу вышэй, чым у нас па Беларусі.

Прыводжу лічбы.

Прырост пагалоўя коней па Беларусі раўняецца 0,8 проц., па Саюзу + 5 проц.; прырост пагалоўя буйнай рагатай жывёлы па Беларусі раўняецца 23,7 проц., па Саюзу + 18 проц.; прырост пагалоўя свіней па Беларусі + 35,2 проц., па Саюзу + 38,6 проц.; прырост пагалоўя авечак і коз па Беларусі + 12,3 проц. і па Саюзу + 25 проц.

Не ўсе ў нас раёны выканалі дзяржаўны план развіцця жывёлагадоўлі. Значная частка раёнаў гэты план недавыканала. Гэта недавыкананне падае, галоўным чынам, на захаванне маладняка, у першую чаргу па жарабятах. А ёсць у нас такія раёны, якія па ўсіх відах жывёлы не выканалі план захавання маладняка.

Я прывяду тыя раёны, якія па ўсіх відах не выканалі план, напрыклад:

Бярэзінскі раён па жарабятах план выканаў на 71,7 проц., па цялятах—на 99,2 проц., па ягнятах—на 43,6 проц., па свіннях—на 97,2 проц.;

Глускі раён па жарабятах план выканаў толькі на 51 проц., па цялятах—на 93,5 проц., па ягнятах—на 48,7 проц., па свіннях—на 89,4 проц.;

Грэскі раён па жарабятах план выканаў на 42,3 проц., па цялятах—на 79,2 проц., па ягнятах—на 71,3 проц., па свіннях—на 93,8 проц.;

Жлобінскі раён план выканаў па жарабятах на 66,3 проц., па цялятах—на 98,7 проц., па ягнятах—на 30,6 проц., па свіннях—на 76,5 проц.;

Кіраўскі раён план выканаў па жарабятах на 62,1 проц., па цялятах—на 88 проц., па ягнятах—на 45,6 проц. і па свіннях—на 86,1 проц.

Такім чынам, таварышы, на агульным фоне безумоўнага ўздыму жывёлагадоўлі як па Саюзу, так і па Беларусі ў нас ёсць рад раёнаў, якія нас падвялі. Таксама мы павінны зрабіць для сябе вывады з таго, што сярэдні процант прыросту пагалоўя жывёлагадоўлі па Саюзу вышэй, чым прырост па Беларусі. Гэта значыць, што мы адсталі ад агульных тэмпаў развіцця жывёлагадоўлі, якіх дабіўся ўвесь Совецкі Саюз.

Некаторыя таварышы прабуюць тлумачыць гэта тым, што, моў, у свой час у некаторых рэспубліках, краях і абласцях Саюза быў вялікі процант знішчэння жывёлы, а ў нас, моў, процант змяншэння быў ніжэй, таму і тэмпы ўздыму жывёлагадоўлі ў іншых абласцях вышэй, а ў нас ніжэй.

Няма чаго і гаварыць аб негрунтоўнасці гэтых матываў. Больш таго, гэтыя матывы з'яўляюцца сапраўднымі апартуністычнымі матывалі, бо калі гэтыя матывы будуць у хаду сярод нашых работнікаў, то гэта значыць паставіць пад пагрозу план развіцця жывёлагадоўлі ў 1936 годзе. Трэба гэтым апартуністычным матывам даць самы рашучы адпор. У нас ёсць усе ўмовы для таго, каб і ў развіцці жывёлагадоўлі быць у радзе перадавых рэспублік і абласцей.

Я назваў раёны і сярэднія лічбы для таго, каб члены ЦВК, таксама ўсе калгаснікі і ўсе работнікі зрабілі для сябе адпавед-

Прэзідэнцкая бібліятэка Рэспублікі Беларусь

ныя вывады і каб 1936 год зрабіць годам высокіх тэмпаў работы ў развіцці жывёлагадоўлі.

У 1935 годзе наша сельская гаспадарка атрымала многа тэхнікі. Напрыклад, у нас павялічыўся трактарны парк, многа завезена ў сельскую гаспадарку БССР розных сельскагаспадарчых машын і аўтамабіляў. У некаторых раёнах ужо ёсць па 2 МТС. Гэта тэхніка дае нам магчымасць з поспехам весці барацьбу за высокую прадукцыйнасць калгаснай гаспадаркі.

## 4. Вынікі развіцця совецкага гандлю і тавараабароту

Значныя дасягненні мы маем у 1935 годзе і па развіццю совецкага гандлю, па развіццю тавараабароту.

Назаву некаторыя лічбы, якія пацвярджаюць гэта.

У 1934 годзе план тавараабароту па БССР складаў 1.192,1 млн. руб., а ў 1935 годзе план тавараабароту раўняўся 1.600,0 млн. руб., або вырас на 33,9 проц.

1935 г. быў характэрным годам па развіццю совецкага гандлю і тавараабароту. Гэта, галоўным чынам, звязана з адменай картачнай сістэмы на хлеб і іншыя сельскагаспадарчыя прадукты. Усе памятаюць, якое значэнне мела для нашай краіны гэта мерапрыемства партыі і совецкай улады. Дзякуючы агульнаму ўздыму нашай соцыялістычнай эканомікі мы мелі магчымасць адмяніць картачную сістэму снабжэння і стаць на шлях шырокага разгортвання совецкага гандлю, а значыць і ўсяго тавараабароту.

Такім чынам, першы год работы без картак паказаў нам значны разбег тавараабароту. Гэта адбілася і на зніжэнні рознічных цэн на ўсе прадукты як па дзяржаўнаму і кааперацыйнаму гандлю, так і на зніжэнні рынанчых цэн.

Назаву лічбы зніжэння гэтых цэн. Цэны на хлеб у дзяржаўнай і кааперацыйнай гандлёвай сетцы знізіліся на 15 проц., на жытнюю муку на 36 проц., крупы—30 проц., макароны—30 проц., каўбасу — 43,8 проц., мяса — 32,8 проц., масла—37,5 проц., кандзіцерскія вырабы—52 проц., цукар—рафінад—45,3 проц. рыбу—45,7 проц., масла расліннае—38,5 проц.

А вось прыклады зніжэння рыначных цэн.

Калі ўзяць асноўныя гарады Беларусі—Менск, Віцебск, Гомель,—то дынаміка рыначных цэн выглядае наступным чынам:

Рыначныя цэны на жытнюю муку па Менску знізіліся на 39 проц., па Віцебску—на 40 проц. і па Гомелю—на 23 проц.

Цэны на бульбу знізіліся па Менску на 45 проц., па Віцебску—на 50 проц. і па Гомелю—на 34 проц.

Цэны на мяса знізіліся па Менску на 26 проц., па Віцебску—на 25 проц. і па Гомелю—на 18 проц.

Цэны на сала знізіліся па Менску на 40 проц., па Віцебску—на 40 проц. і па Гомелю—на 5 проц.

Цэны на масла знізіліся па Менску на 29 проц., па Віцебску—23 проц. і па Гомелю—на 25 проц.

Цэны на малако знізіліся па Менску на 20 проц., Віцебску—7 проц. Гомелю—18 проц.

Такім чынам, таварышы, мы маем рэальныя вынікі той эканамічнай палітыкі, якая праводзіцца нашай партыяй і совецкай

уладай. А палітыка гэта накіравана на лепшае матэрыяльнае забеспячэнне ўсіх працоўных мас.

У сувязі з адменай картачнай сістэмы партыяй і ўрадам праведзена работа па рэарганізацыі гандлёвых арганізацый. Ужо вядома, што рэарганізавана спажывецкая кааперацыя. Яе работа, галоўным чынам, канцэнтруецца на вёсцы, а ў гарадах рэзка расшыраецца дзяржаўны гандаль. Гэтыя арганізацыйныя мерапрыемствы накіраваны да таго, каб лепш упарадкаваць справу разгортвання тавараабароту і совецкага гандлю і падцягнуць совецкі гандаль на вёсцы.

З гэтых даных выцякае, што і матэрыяльнае становішча рабочых, служачых і калгаснікаў таксама значна павышаецца.

## 5. Вынікі фінансавай работы

1935 год быў таксама годам значнага ўзмацнення фінансавай сістэмы ў нашай краіне. Уздым соцыялістычнай эканомікі не мог не адбіцца і на ўмацаванні совецкага рубля. Гэты фактар мае важнае значэнне ў першую чаргу для павышэння рэальнай зарплаты рабочых і служачых.

Мы па БССР у 1935 г. з поспехам выканалі ўвесь фінансавы план, у тым ліку і план мабілізацыі сродкаў. Гэта пацвярджаецца наступнымі фактамі.

Зводны бюджэт (рэспубліканскі і мясцовы) па даходах у нас выканан на 111,8 проц., па расходах на 101,9 проц.

План мабілізацыі сродкаў насельніцтва выканан на 104,8 проц.

Уклады ў ашчадкасы таксама павялічваюцца. План выканан на 135,7 проц. Рэалізацыя пазыкі трэцяга года другой пяцігодкі выканана на 107,1 проц. Прыбыткі аграмаджанага сектара, у тым ліку і рэспубліканскай прамысловасці выкананы на 180 проц. Планы дзяржаўных даходаў з аграмаджанай гаспадаркі на працягу апошніх гадоў значна перавыконваюцца. Так, у 1933 годзе выкананне даходаў з аграмаджанай гаспадаркі складала 102,9 проц., у 1934 годзе—100,8 проц., а ў 1935 годзе—114,4 проц. Пры гэтым план чацвертага квартала 1935 года выканан і перавыканан пераважнай колькасцю раёнаў БССР. Такім чынам, мы далі прыбыткаў у нашу совецкую казну больш чым на 55 мільёнаў супроць тых выдаткаў, якія зроблены па плану 1934 года.

Характэрным фактарам з'яўляецца ўзмацненне фінансавага становішча калгасаў. Гэта сведчыцца наступнымі данымі: уклады калгасаў на бягучы рахунак Дзяржбанка на 1 студзеня 1935 года складалі 9,2 млн. руб., а на 1 студзеня 1936 года сума ўкладаў калгасаў на бягучыя рахункі Дзяржбанка ўжо дасягнула да 20,4 млн. руб.

Гэты факт з'яўляецца вельмі характэрным. Ён сведчыць аб росце эканомікі калгаснікаў, як прырост укладаў у ашчадкасы сведчыць аб росце дабрабыту рабочых і служачых.

Як завяршаючы вынік нашых гаспадарчых поспехаў у 1935 годзе трэба адзначыць паспяховае выкананне нашых абавязацельстваў перад дзяржавай па ўсіх відах загатовак.

Хлебапастаўкі БССР выканала ў 1935 годзе на 108,6 проц., прычым скончыла гэтыя пастаўкі 16 верасня; бульбапастаўкі

Прэзідэнцкая бібліятэка Рэспублікі Беларусь

выкананы на 100,1. проц., скончылі мы іх 10 лістапада; ільнозагатоўкі выкананы на 104,9 проц., скончылі іх 4 снежня 1935 года.

У параўнанні з 1934 г. мы маем рост загатовак: па ільну на 31 проц., па бульбе на 16,6 проц.

Такім чынам, мы маем права заявіць на сесіі ЦВК БССР, што агульныя вынікі гаспадарчага развіцця ў 1935 годзе з'яўляюцца вынікамі вельмі становучымі. Яны сведчаць аб тым, што ўся народная гаспадарка БССР, а таксама і эканоміка шырокіх мас працоўных ўзнімаецца ўверх гіганцкімі крокамі. **(Апладысменты.)**

## 6. Аб галоўным дасягненні 1935 года

Самым важным дасягненнем 1935 года, як і па ўсяму Совецкаму Саюзу, у нас у БССР з'яўляецца развіццё стаханаўскага руху.

1935 год быў годам, калі барацьба за высокую прадукцыйнасць працы вылілася ў стаханаўскі рух.

Я не буду, таварышы, растлумачваць значэнне стаханаўскага руху, яго прычыны і яго істокі.

Наш настаўнік і правадыр таварыш **Сталін** геніяльна растлумачыў істокі, прычыны і значэнне гэтага стаханаўскага руху ў сваёй гістарычнай прамове на стаханаўскай нарадзе ў Крэмлі. Скажу толькі, што полымя стаханаўскага руху ахапіла і шырокія масы рабочых БССР і не толькі рабочых, але і калгаснікаў.

Даволі ўказаць на тое, што ў нас з'явіліся тысячы стаханаўцаў якія паказваюць ужо ўсесаюзныя рэкорды.

Назаву імёны некаторых перадавікоў—стаханаўцаў Беларусі, якія ўслед за Стахацавым, Бусыгіным, Крываносам, Вінаградавымі, Сметаніным і інш. паказалі прыклады высокай прадукцыйнасці працы.

Гэта наступныя знатныя людзі БССР, якія зламалі ўсе тэхнічныя нормы і перавыконваюць іх у 3—4 разы:

Скабло Г. (ф-ка імя Кагановіча) выканаў план на 355,0 проц.; Скабло З. (ф-ка імя Кагановіча)—354,0 проц.; Розенберг (ф-ка імя Кагановіча)—351,0 проц.; Турэцкі (ф-ка імя Кагановіча)—406,0 проц.; Мілюкоўскі (завод „Большэвік")—380,0 проц.; Гуртоўнік (ф-ка імя Куйбышэва)—287,0 проц.; Глушакоў (Рымарная фабрыка)—393,0 проц.; Ратнер (ф-ка „Кастрычнік")—250,0 проц.; Папкова (ф-ка „Сцяг індустрылізацыі")—244,0 проц.; Гозман (ф-ка „Комінтэрн")—260,0 проц.; Ясенеў (ф-ка імя Дзяржынскага)—250,0 проц.; Рэкман (ф-ка „КІМ")—242,0 проц.; Ёўдакімчык (ф-ка 8 сакавіка)—260,0 проц.; Гіляшэвіч (з-д імя Варашылава)—350,0 проц.; Лібман (з-д імя Варашылава)—380,0 проц.; Харнас (з-д імя Варашылава)—354,0 проц.; Кісель (з-д імя Кірава)—324,0 проц.; Галаўня (з-д імя Кірава)—360,0 проц.; Латышэўскі (з-д імя Кірава, Віцебск)—392,0 проц.; Князін (з-д імя Кірава, Віцебск)—389,0 проц.; Міхелес (з-д імя Дзімітрава)—490,0 проц.; Гладышоў (Бабруйскі камбінат)—478,0 проц.; Рушко (Бабруйскі камбінат)—269,0 проц.; Смольскі (віцебскі лесазавод)—474,0 проц.; Табола (мазырскі лесазавод)—233,0 проц.; Быхавец (рагачоўскі лесазавод)—266,0 проц.; Пінчук (ф-ка „Комунарка")—825,0 проц.; Зінкевіч (ф-ка „Комунарка")—425,0 проц.; Лютэрман (ф-ка Комунарка")—425,0 проц., Таболіна (ф-ка „Комунарка")—425,0 проц.; Лемперт (камбінат „Спартак")—400,0 проц.; Папко (дражджавы з-д" Чырвоная зара")—320,0 проц.; Перасецкі (драждж. завод „Чырвоная зара")—320,0 проц.; Ірзуноў (барысаўскі хлебазавод)—

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы